цэнтраў з пэўнымі асаблівасцямі, якія вызначаліся гістарычным лёсам рэгіёна, яго дэмаграфічнай сітуацыяй і інш. абставінамі.

Рост гарадскога насельніцтва у парэформенны перыяд стаў не толькі сведчаннем капіталістычнага развіцця краю, але і з'явіўся падмуркам для яго духоўнага адраджэння, звязанага з развіццём нацыянальнай культуры і фарміраваннем беларускай нацыі. З пашырэннем рынкавых адносін беларускія гарады бралі на сябе арганізацыйныя функцыі ў адносінах да акружаючага наваколля не толькі у галіне эканомікі, але і у галіне культурных адносін за кошт перанясення на яго навуковых, духоўных і культурных дасягненняў.

Літаратура


1. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г.; / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб.: Тип. Е. Евдокимова, 1900. – Т. IV: Виленская губерния. – 1904. – Тетрадь 3. – 179 с.
2. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г.; / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб.: Тип. Е. Евдокимова, 1900. – Т.V: Витебская губерния. – 1903. – Тетрадь 3. – 282 с.
3. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г.; / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб.: Тип. Е. Евдокимова, 1900. – Т.XI: Гродненская губерния. – 1904. – 319 с.
4. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г.; / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб.: Тип. Е. Евдокимова, 1900. – Т. XXII: Минская губерния. – 1904. – 241 с.
5. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г.; / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб.: Тип. Е. Евдокимова, 1900. – Т.XXIII: Могилёвская губерния. – 1903. – 275 с.
6. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі: у 4-х т. / Н. М. Нікольскі [і інш.]; пад рэд. Н. М. Нікольскага. – Мінск: Акад. Навук БССР, 1936–1953. – Т. 2. Дакументы і матэрыялы па гісторыі беларусі (1772–1903 гг.). / Н.М. Нікольскі [і інш.]; пад рэд. Н. М. Нікольскага. – 1940. – 938с.
7. Документы и материалы по истории Белоруссии: в 4-х т./ В. Н. Перцев [и др.]; под ред. В. Н. Перцева. – Минск: Акад. Наук БССР, 1936–1953. – Т. 3: Документы и материалы по истории Белоруссии (1900-1917 гг.) / В. Н. Перцев [и др.]; под ред. В. Н. Перцева. – 1953. – 1018 с.
8. Шыбека, З.В. Гарады Беларусі ( 60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзяў ) /
9. В. Шыбека. – Мінск: ЭўроФорум, 1997. – 292 с.


## ДЗЕЙНАСЦЬ ОРГАНАЎ СЯЛЯНСКАГА САМАКІРАВАННЯ ПА АПЕКАВАННІ АДНАВЯСКОЎЦАЎ (1861–1914 ГГ.)


Талмачова С.А. Мінск, БДПУ, дацэнт


Важным бокам дзейнасці органаў сялянскага самакіравання ў сацыяльнай сферы з'яўлялася дапамога бедным і тым, хто пацярпеў ад рознага роду няшчасцяў,назіранне за сіротамі, хворымі, адзінокімі (у адпаведнасці з нормамі

звычаёвага права), а таксама утрыманне грамадскіх хлебных складоу (так званых магазінау), бальніц, багадзельняу і да таго падобных установ – па закону. Мы спынімся менавіта на тых мерапрыемствах, якія выконваліся сялянамі па апекаванню аднавяскоуцау.

Да 1861 г. закон ускладау на памешчыкау абавязак апекаваць прыгонных сялян, якія былі не у стане працаваць [1, арт. 256]. З вызваленнем сялян ад прыгону і з прадстаўленнем ім правоу свабодных сельскіх жыхароу, абавязак гэты быу ускладзены на грамадскае сялянскае кіраванне па прыкладу астатняга падатковага насельніцтва [1, арт. 257]. Сродкамі для папярэджвання жабрацтва сярод былых прыгонных былі, з аднаго боку, меры грамадскай апекі бедных, што не маглі працаваць, а з другога – меры спагнання, якім падвяргаліся тыя сяляне, што зауважаны былі у жабраванні не па прычыне асабістага няшчасця, якое прывяло гаспадарку у поуную беднасць, а з-за ляноты [2, арт. 1273].

Абмеркаванне мер, якія неабходна было прыняць для апекавання сапрауды збяднелых і немаёмасных, адносілася да кампетэнцыі сельскага і валаснога сходаў [3, № 36657, арт. 51§8, 16, 78§3 ]. На валасных старшынь і старастау ускладвауся абавязак назіраць за тым, каб у грамадзе не было жабрацтва па прычыне дармаедства. Службовыя асобы прыцягваліся да адказнасці у выпадку выдачы пашпартау тым асобам, якія не маглі пракарміцца асабістай працай [3, № 36657, арт. 58 п.10, 60, 83, 84 п. 8; 1, арт. 264, 266]. У лютым 1862 г. цыркуляр Міністэрства унутраных спрау абавязвау міравых пасрэднікау растлумачыць валасным прауленням і сельскім грамадам часова-абавязаных сялян законы аб мерах папярэджвання жабрацтва [4, л. 28–29 зв.].

"Агульнае палажэнне" (арт. 21, 179) ускладала на грамаду абавязак апекаваць сірот і тых членау грамады, якія не маглі пракарміцца сваёй працай і у якіх не было родных, ці апошнія былі не у стане іх утрымоуваць. Грамадскі дагляд ажыццяуляуся той грамадой, да якой належау сялянін, якому неабходна была дапамога. "Агульнае палажэнне" прапанавала кіравацца звачаем пры выбары формы падобнага дагляду (арт. 21), і у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай губернях ён залежау ад рашэння сельскага сходу.

Па "Агульнаму палажэнню" (арт. 78, п. 3) меры грамадскага дагляду падлягалі ведамству валаснога сходу, але часцей права вырашэння гэтага пытання аддавалася сходам той сельскай грамады, дзе меліся асобы, якім патрабавалася апека. Звычайна сіроты, хворыя, старыя, калі мелі зямлю ці якуюнебудзь маёмасць, даглядаліся роднымі (пры іх наяунасці) дабрачынна ці па рашэнні валаснога суда. Апекуны у такім выпадку карысталіся маемасцю і зямлёю тых, каго даглядалі. Зусім лядашчыя і не меушыя ніякай маёмасці сяляне апекаваліся сельскай грамадой. Формы дапамогі былі разнастайнымі. У адных выпадках давалася харчаванне і памяшканне па чарзе у кожным двары, а клопаты аб адзенні ускладаліся на старасту, а затым размяркоуваліся на усю грамаду. У другіх грамадах старога утрымоувалі у чыёй-небудзь хаце ці пры доме валаснога праулення. Калі сяляне, якім неабходна была апека з боку грамады, мелі памяшканне, дзе маглі б жыць, то часам па прыгаворы сельскага сходу рабілася ссыпка хлеба на карысць такіх сялян.

Больш рэдка і толькі па рашэннях валасных судоу сяляне асобных грамад абкладаліся грашовым зборам да 10 р. штогод на карысць аднаго апекаванага. У некаторых выпадках грамада плаціла за утрыманне сваіх жабракоу у бальніцах, але сяляне імкнуліся пазбегнуць адпрауляць сваіх аднаабшчыннікау у багадзельні па прычыне нежадання плаціць за іх утрыманне [5, л. 62; 6, с. 433; 7, с. 46].

Грамада брала на сябе апеку над вяскоуцамі толькі ў тых выпадках, калі тыя зусім не мелі родных ці родным самім патрэбна была дапамога. Аднак дабрачынных грашовых складак на дагляд жабракоу ці сірот па ініцыятыве саміх грамад не было – сяляне адносіліся вельмі адмоуна да просьбау аб даглядзе, і часта гэтыя пытанні вырашаліся у валасных судах [8, л. 23–24; 5, л. 31 зв.; 6, с. 433–443].

Мінская губернская па сялянскіх справах установа у першай палове 80-х гг. XIX ст. выдала інструкцыю па абароне маёмасных правоу сірот у адносінах да спадчыны, а таксама па усталяванню апек над сялянамі і кантролю за дзейнасцю апекуноу. У адпаведнасці з гэтым дакументам у некаторых выпадках павятовыя сялянскія установы прызначалі дапамогу немаёмасным у памеры 36 р. штогод, раскладка праводзілася сялянамі па прыгаворы сходу, а грошы выдаваліся з валаснога праулення [5, л. 41. 395–399].

Мінская губернская нарада па пытаннях перагляду заканадауства аб сялянах адзначала, што не толькі ва установах па сялянскіх справах, але і у валасных прауленнях не было ніякіх сведчанняу аб усіх асобах, якія карысталіся якойнебудзь дапамогай паселішчау і сельскіх грамад, за выключэннем тых выпадкаў, якія разглядаліся валасным судом. Таму нават сучаснікі не мелі дакладных даных аб колькасці падобных асоб па грамадах, хаця факт існавання некаторай лічбы немаёмасных у кожнай грамадзе не падлягае сумненню [8, л. 23–24; 6, с. 443].

У Магілёускай губ. па загадах мясцовай адміністрацыі грамадскі дагляд быу арганізаваны інакш. Ва усіх паветах, за выключэннем Гомельскага, на грошы, сабраныя па прыгаворах валасных сходау, уладкаваны былі дамы дагляду, у якіх старыя і пакалечаныя, што не мелі сваіх дамоу, даглядаліся за кошт штогадовага збору з воласці. З гэтага ж збору, а у некаторых паветах са збору з грамад, штомесячна выдавалася грашовая дапамога у памеры 1–3 р. тым, хто меу свае дамы. Пры апекаванні ў асабістых дамах і ахвяраваннях прадуктамі харчавання на утрыманне аднаго чалавека штогод трацілася каля 20 р., што складала каля 2 к. з надзелу ці прыблізна ½ к. з дзесяціны. Уладкаванне дамоу дагляду адбылося хаця і па прыгаворах сходау, але па загаду адміністрацыі, якая у розных паветах кіравалася рознымі поглядамі, таму колькасць гэтых установ размяркоувалася нераўнамерна. Напрыклад, у Аршанскім павеце пры кожнай воласці былі створаны дамы апекі на 10 чалавек, у Рагачоускім – адзін для усяго павета на 20 чалавек. Акрамя асабіста мірскога збору, на утрыманне тых жа дамоу апекі

ішлі і штрафы, што спаганяліся па рашэннях валасных судоў і устаноў па сялянскіх справах. Аднак сяляне неахвотна ішлі ў дамы дагляду, а аддавалі перавагу дапамозе грашыма ад воласці ці грамады [6, с. 445, 490].

У 1891 г. на апекаванне сялянамі было выдаткавана 19650 р. (у сярэднім па 28,8 р. на воласць), з якіх 16081 р. (82%) пакрываліся з валасных сум. У адносных лічбах больш за усіх на азначаныя патрэбы расходавалі сяляне Віцебскай губ. – у сярэднім па 59 р. на воласць, у Магілёўскай – па 38,6 р., а ў Віленскай і Гродзенскай – адпаведна па 5,1 р. і 16,4 р. (гл. Табліцу 1) [9, с. 2–5, 8–9, 14–15, 32–35, 38–39, 44–47, 68–71, 74–75, 78–81].

У 1905 г. на апекаванне і грамадскую дапамогу сяляне 5 беларускіх губерняў выдаткавалі 25230 руб. (у сярэднім па 37,5 руб. на воласць). Аднак калі ў Віленскай, Віцебскай і Гродзенскай расходы на азначаныя патрэбы не перавышалі 10 руб. на воласць у сярэднім (па 8,1 р., 7,4 р. і 9,8 р. адпаведна), то у Магілёўскай губ. гэты паказчык склаў 353 руб., а усяго у губерні – 17861 р. Прыклад такіх выдаткаў не быў тыповым. Наадварот, з развіццём капіталістычных адносін сяляне усё з большай неахвотай давалі грошы на дагляд маламаёмасных аднаабшчыннікаў. У прыватнасці, у Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай губернях сельскія і валасныя выдаткі на названыя патрэбы скараціліся з 1891 да 1905 г. адпаведна на 89,2%, 46,7% і 45,4% (гл. Табліцу 2) [9, с. 2–5, 8–9, 14–15, 32–35, 38–39, 44–47, 68–71, 74–75, 78–81; 10, с. 302, 400].

Такім чынам, у другой палове XIX ст. органы сялянскага самакіравання надавалі вялікую увагу апекаванню і дагляду немаёмасных членаў. Часам гэта было вынікам пастаноў і цыркуляраў мясцовай адміністрацыі, а ў многіх мясцовасцях мела падставай звычаі. Формы апекавання і дагляду таксама адрозніваліся. Паступова воласці імкнуліся паменшыць гэтыя выдаткі, і толькі павятовая і губернская адміністрацыя стрымлівала гэтае жаданне.

Трэба адзначыць, што асаблівасцю сацыяльнай дапамогі ў беларускіх губернях было тое, што жабрацтва тут было традыцыйна менш распаўсюджана, чым увогуле па Расіі. Аб гэтым гавораць даныя Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г., а таксама разнастайныя сведчанні сучаснікаў (міравыя пасрэднікі, земскія начальнікі, чыноўнікі розных узроўняў, матэрыялы камісіи і перыядычнага друку ды інш.) [11, с. 375]. Найбольшая колькасць жабракоў была ў Віленскай губ. – 40 чал. на кожныя 10 тыс. чал. насельніцтва, у Віцебскай – 30, Магілёўскай – 25, Мінскай – 20, а найменшыя паказчыкі назіраліся у Гродзенскай губ. – 2,1 чал. на кожныя 10 тыс. чал. насельніцтва. А.Д.Грыгор'еў прыйшоў да высновы, што прычынай такога становішча былі меры па прафілактыцы жабрацтва, прадпрынятыя яшчэ ў Вялікім княстве Літоўскім [11, с. 375].

Важнай складовай часткай сацыяльнай сферы дзейнасці сялянскага самакіравання была дапамога аднаабшчыннікам (гл. Табліцы 1, 2). Выдаткі на гэта у другой палове XIX ст. былі даволі значныя, аднак далека не усе фіксаваліся у афіцыйных справаздачах. У некаторых выпадках ацаніць грашыма дапамогу было немагчыма, напрыклад, калі аднавяскоўцы дапамагалі ў зборы ураджаю ці будоўлі новага дома, за якія сяляне расплачваліся па-асобку. Па афіцыйнай статыстыцы, у 1891 г. на дапамогу аднаабшчыннікам з мірскіх капіталаў было выдаткавана 25241 р., што складала у сярэднім па 37 р. на воласць. Найбольшыя сумы выдаткоўваліся у Віцебскай губ. і Магілёўскай губ. – адпаведна па 67,9 р. і 50,6 р. на воласць, а найменшыя – у Віленскай губ. – у сярэднім па 5,1 р. у кожнай воласці. Такія паказчыкі, верагодна, былі звязаны з захаваннем абшчыннай формы землекарыстання ў першых дзвюх губернях.

Каля 80% усіх грошай на дапамогу аднаабшчыннікам выдаткоўвалася з валасных сум, але у Віленскай губ. на валасныя расходы прыпадала 31,9% ад усёй сумы на азначаныя патрэбы, а у Віцебскай – 91,8%. У прыватнасці, дапамога пацярпелым ад неўраджаю аказвалася практычна ва ўсіх губернях выключна з валасных сум, акрамя Мінскай, дзе валасныя выдаткі на гэтыя патрэбы складалі 58,5%, а астатнія грошы ішлі з сельскіх сум. Увогуле на дапамогу тым, хто пацярпеў ад неўраджаю, у 1891 г. у 5 беларускіх губернях з мірскіх капіталаў было выдаткавана 1695 р., пры гэтым у Віцебскай губ. гэтая сума складала 778 р., а у Віленскай – толькі 2 р. на губерню [9, с. 2–5, 8–9, 14–15, 32–35, 38–39, 44–47, 68–71, 74–75, 78–81]. Уяўленне аб выдатках сялян беларускіх губерняў на дабрачыннасць у параўнанні з аналагічнымі выдаткамі ў некаторых іншых губернях Расійскай імперыі даюць лічбы, прыведзеныя у табліцы 3 [11, с. 379]. У 1893 г. выдаткі сялянскіх грамад Магілёўскай губ. на апекаванне і дапамогу аднавяскоўцам склалі 130 р.18 кап. у сярэднім на воласць, адначасова у С.-Пецярбургскай губ. – 26 р. 18 кап., а у Маскоўскай – 8 р. 34 кап. Гэта сведчыць аб лепшай арганізацыі справы грамадскай дапамогі і апекавання ў беларускіх сялян [12, т.1, с. 96; 11, с. 379].

Такім чынам, у тых мясцовасцях, дзе была пашырана абшчынная форма землекарыстання зямлёй (Віцебская і Магілёўская губерні), сяляне часцей дапамагалі аднаабшчыннікам у цяжкіх выпадках. Больш хуткі рост капіталістычных адносін, эканамічнай дыферэнцыяцыі пры падворным землекарыстанні прыводзілі да скарачэння выдаткаў з мірскіх капіталаў на сацыяльныя патрэбы. Аднак трэба адзначыць, што сумы на дапамогу аднаабшчыннікам часцей у некалькі разоў перавышалі выдаткі з сельскіх сум, што было звязана, верагодна, па-першае, з тым, што выдаткі з валасных сум улічваліся больш дакладна, а па-другое, тым, што сельскія грамады дапамагалі аднавяскоўцам часцей тымі спосабамі, якія не падлягалі афіцыйнаму уліку. Менавіта у нізавых структурах (на сельскіх і селенных сходах) часцей існавала сапраўднае самакіраванне, у той час як валасныя сходы і службовыя асобы часцей выконвалі распараджэнні начальства.

*Таблица 1*

Выдаткі з мірскіх капіталаў на дапамогу аднаабшчыннікам у 1891 г.

| Губерні | Выдаткі на грамадскія абеды у святочныя дні | | | Дапамога тым, хто пацярпеў ад няураджаю | | | Апекаванне | | | Ахвяраванні | | | УСЯГО | У тым ліку з валасных сум | Выдаткавана з валасных сум ад агульнай колькасці (%) | У сярэднім на валасць (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго | З валас ных сум (руб.) | З валас ных сум (%) | Усяго | З валас ных сум (руб.) | З валас ных сум (%) | Усяго | З валас ных сум (руб.) | З валас ных сум (%) | Усяго | З валас ных сум (руб.) | З валас ных сум (%) | | | | |
| Віленская (4 паветы) | 0 | 0 | 0 | 2 | 2 | 100,0 | 487 | 154 | 31,6 | 0 | 0 | 0 | 489 | 156 | 31,9 | 5,1 |
| Віцебская (5 паветаў) | 50 | 50 | 100,0 | 778 | 778 | 100,0 | 5657 | 5125 | 90,6 | 33 | 33 | 100 | 6518 | 5986 | 91,8 | 67,9 |
| Гродзенская (6 паветаў) | 0 | 0 | 0,0 | 10 | 10 | 100,0 | 2376 | 1764 | 74,2 | 147 | 147 | 100 | 2533 | 1921 | 75,8 | 17,5 |
| Мінская | 311 | 61 | 19,6 | 364 | 213 | 58,5 | 5534 | 4702 | 85,0 | 2153 | 1877 | 87,2 | 8362 | 6853 | 82,0 | 41,4 |
| Магілёўская | 134 | 56 | 41,8 | 541 | 533 | 98,5 | 5596 | 4336 | 77,5 | 1068 | 564 | 52,8 | 7339 | 5489 | 74,8 | 50,6 |
| Усяго | 495 | 167 | 33,7 | 1695 | 1536 | 90,6 | 19650 | 16081 | 81,8 | 3401 | 2621 | 77,1 | 25241 | 20405 | 80.8 | 37,0 |

Падлічана: Временник Центрального статистического комитета МВД. СПб., 1895. № 38. Мирские расходы и доходы крестьян за 1891 год в 50-ти губерниях Европейской России. С. 2–5, 8–9, 14–15; 32–35, 38–39, 44–47; 68–71, 74–75, 78–81.

*Табліца 2*

**Дынаміка выдаткаў на грамадскі дагляд і дабрачыннасць**

| Губерні | 1891 г. | | | | 1905 г. | | | | Павелічэнне (+) ці памяншэнне (-) выдаткаў (%) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | З валасных сум | З сельскіх сум | УСЯГО | У сярэднім на валасць (руб.) | З валасных сум | З сельскіх сум | УСЯГО | У сярэднім на валасць (руб.) | |
| Віленская (4 паветы) | 156 | 333 | 489 | 5,1 | 742 | 0 | 742 | 8,1 | +51,7 |
| Віцебская (5 паветаў) | 5986 | 532 | 6518 | 67,9 | 283 | 424 | 707 | 7,4 | -89,2 |
| Гродзенская (6 паветаў) | 1921 | 612 | 2533 | 17,5 | 1080 | 271 | 1351 | 9,8 | -46,7 |
| Мінская | 6853 | 1509 | 8362 | 41,4 | 4293 | 276 | 4569 | 110,4 | -45,4 |
| Магілёўская | 5489 | 1850 | 7339 | 50,6 | 15141 | 2720 | 17861 | 353,0 | +143,4 |
| **Усяго** | **20405** | **4836** | **25241** | **37,0** | **21539** | **3691** | **25230** | **37,5** | **0,0** |

Падлічана па: Временник Центрального статистического комитета МВД. № 38. Мирские расходы и доходы крестьян за 1891 г. в 50-ти губерниях Европейской России. – СПб., 1895. С. 2–5, 8–9, 14–15, 32–35, 38–39, 44–47, 68–71, 74–75, 78–81; Мирские доходы и расходы за 1905 год по 50-ти губерниям Европейской России / Составлено статистическим отделением. СПб., 1909. С. 302, 400.

*Табліца 3*

**Выдаткі сялянскіх грамад на дабрачыннасць** [11, с. 379].

| Губерня | Выдаткі на 1 сельскага жыхара (кап.) | Выдаткі на апекаванне і лячэнне збяднелым (руб.) | Выдаткі на ахвяраванні з дабрачыннымі мэтамі (руб.) |
|---|---|---|---|
| Магілёўская | 2,4 | 18394 | 5251 |
| Віцебская | 0,5 | 2108 | 1793 |
| Мінская | 0,3 | 1243 | 4127 |
| Гродзенская | 0,2 | 474 | 1863 |
| Віленская | 0,2 | 823 | 417 |
| С.-Пецярбургская | 2,4 | 8561 | 6581 |
| Маскоўская | 0,5 | 4145 | 2335 |
| Смаленская | 0,7 | 7844 | 2379 |

Літаратура


1. Свод законов Российской империи. СПб.: Гос. тип., 1857. Т. XV. Ч. I.

2. Свод законов Российской империи. Устав о предупреждении и пресечении преступлений. СПб.: Гос. тип., 1857. Т. XIV.
3. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). 2-е собр. Т. XXXVI. 1861. СПб.: Гос. тип., 1863.
4. Нацыянальны гістарычны архіу Беларусі (НГАБ), г. Мінск, ф. 242, воп. 1, спр. 96.
5. НГАБ, ф. 242, воп. 1, спр. 2568.
6. Свод заключений губернских совещаний по вопросам, относящимся к пересмотру законодательства о крестьянах: В 3-х т. СПб.: Тип-я М-ва внутренних дел, 1897. Т. II. – 767 с.
7. Стефанович К. О сельском и волостном управлении в Северо-Западном крае. СПб., Тип-я Глазунова, 1895. – 207 с.
8. НГАБ, ф. 68, воп. 1, спр. 2.
9. Временник Центрального статистического комитета МВД. № 38. Мирские расходы и доходы крестьян за 1891 г. в 50-ти губерниях Европейской России. СПб.: Центральный статистический комитет МВД, 1895.
10. Мирские доходы и расходы за 1905 год по 50-ти губерниям Европейской России / Составлено статистическим отделением. СПб.: "Электро-типография Н.Я. Стойковой", 1909. – 404 с.
11. Григорьев А.Д. История социальной работы: В 2 ч.: Учеб. пособие для студентов высш. учеб. заведений. Мн.: ТетраСистемс, 2006. Ч. 1 (до начала XX в.). – 464.
12. Благотворительность в России: В 3-х т. СПб., 1907.

## РОССИЯ В НАЧАЛЕ XX В.: САМОДЕРЖАВНАЯ ВЛАСТЬ В ПОИСКАХ ПУТЕЙ САМОСОХРАНЕНИЯ

Левкович Н.Д. г. Минск, БДПУ, доцент

Первостепенное значение в истории России начала XX в. имел вопрос о государственной власти. Новое время бросало исторический вызов царской монархии, стремящейся удержать руль государственного управления и не желающей идти на глубокие демократические преобразования в стране. Самодержавная власть оказалась перед исторической альтернативой: искать пути к пониманию скорейшей и всесторонней модернизации страны или стремиться всеми силами удержать устаревший, рушащийся мир.

На этом переломе исторического развития России должны были проявиться и вековой опыт монархического правления, и личные качества российского самодержца, во многом определявшего ход исторических событий в стране. Вопрос заключался в способности Николая II и его окружения на «крупные политические маневры», на глубокие преобразования в обществе в демократическом направлении.